■ Класныя навіны

# ШКОЛЫ НЕ ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ ПЕДАГОГАЎ?




## Трэць навучэнцаў педагагічных класаў ужо вызначыліся з выбарам прафесіі

*«Малады настаўнік павінен быць не з баязлівага дзясятка. Звярнуць на сябе ўвагу дзяцей — новая суперздольнасць. Прыйшоў час геройстваваць!»*

*«Нарэшце, настаў той дзень, калі мне пашчасціла адчуць сябе настаўнікам. Гэты момант быў непазбежны. Ура! Канешне, я была ўсхваляваная гэтай падзеяй. Я чакала многае, але дзеці — гэта заўсёды энергія юнацтва. Дзе мае 12 гадоў?»*

*«Як жа прыемна быць настаўнікам. Мы можам навучыць дзяцей чаму-небудзь добраму».*

*«Сёння замяняў «Чалавек і свет» у 2 «Г» класе. Вельмі адкрытыя, працалюбівыя і вясёлыя дзеці. Урок прайшоў цудоўна. Жадаю ім удачы ў вучобе!»*

*«Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца — вось галоўны наказ, мой юны вучань!»*

*«Цяжка ў вучобе? Давайце дапаможам 7 класу, які стаў нам як родны».*

Аўтары гэтых радкоў яшчэ не маладыя педагогі, але вельмі спадзяюцца імі стаць. Сваімі думкамі і ўражаннямі ад першых прафесійных спробаў дзеляцца ў сваіх блогах вучні профільных педагагічных класаў 20-й сталічнай гімназіі. Менавіта гэта навучальная ўстанова стала пянерам у адраджэнні педагагічных класаў: тут у 2014 годзе былі адкрыты чатыры профільныя 10-я класы, якія ўзяў пад сваю апеку Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт. Фактычна яны пачалі функцыянаваць, калі ў краіне яшчэ не была створана для іх нарматыўна-прававая база.

Між іншым, у 1990-я гады ў 176-й мінскай школе (якая пазней былаператворана ў 20-ю гімназію) ужо дзейнічалі фізіка-матэматычныя і філалагічныя педагагічныя класы. І сёння іх выпускнікі працуюць у роднай школе, але ўжо ў якасці педагогаў. Чым не выдатная наглядная агітацыя за прафесію настаўніка?

### ІДЭЯ, АКТУАЛЬНАЯ ДЛЯ ЎСІХ

Мінулы навучальны год вызначыўся адкрыццём педагагічных класаў ужо па ўсёй краіне. Днямі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка прайшла рэспубліканская канферэнцыя, якая сабрала прадстаўнікоў педагагічнай грамадскасці, вучоных і вядучых спецыялістаў-практыкаў у галіне профільнай і прафесійнай педагагічнай адукацыі. У цэнтры іх увагі аказаліся вопыт, праблемы і перспектывы педагагічных класаў.

**Рэктар БДПУ, прафесар Аляксандр ЖУК** канстатуе, што ў грамадстве і СМІ ўсё часцей падымаецца тэма адраджэння прэстыжу настаўніцкай працы. У нашай краіне ўсё больш адчувальная дзяржаўная падтрымка педагога, што робіць настаўніцкую прафесію канкурэнтаздольнай і прывабнай.

Дарэчы, ідэя падрыхтоўкі вучняў да свядомага выбару педагагічнай прафесіі становіцца ўсё больш папулярнай не толькі ў нас. У Еўропе лідзіруючую пазіцыю ва ўкараненні ідэй профільнай педагагічнай падрыхтоўкі ў школе займае Чэхія, у якой у 2011 годзе стартаваў праект па арганізацыі працы педагагічных ліцэяў і школ.

Ва ўмовах 13-годкі там рэалізуюцца тры мадэлі профільнага навучання: чатырохгадовая праграма інтэграванай педагагічнай і агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі, пачынаючы з 10-га класа, шасцігадовая праграма — з 8-га класа і васьмігадовая — з 6-га класа. Выпускнікам педагагічных школ і ліцэяў прысвойваецца кваліфікацыя выхавацеля дзіцячага садка, кіраўніка дзіцячага гуртка, памочніка выхавальніка ў інтэрнаце, а таксама прадастаўляецца права прывілеяванага паступлення ва ўніверсітэты, якія ажыццяўляюць прафесійную падрыхтоўку настаўнікаў.

**Важны кірунак — праца з бацькамі навучэнцаў педагагічных класаў, якія могуць або падтрымаць выбар дзіцяці, або, наадварот, навязаць ім сваю думку і свой выбар. Для школы яны галоўныя саюзнікі...**

### ПАРТФОЛІА ДЛЯ БУДУЧАГА НАСТАЎНІКА

У 2015/2016 навучальным годзе ва ўсіх рэгіёнах і ў сталіцы было створана больш як 100 педагагічных класаў і груп, якія ахаплівалі больш як 1440 навучэнцаў. Сутнасць профільнай падрыхтоўкі заключаецца ў вывучэнні пэўных вучэбных прадметаў (матэматыкі, фізікі, гісторыі і іншых) на павышаным узроўні, а таксама факультатыўных занятках «Уводзіны ў педагагічную прафесію». Гэта першая мадэль. Другая мадэль — стварэнне груп навучэнцаў з розных класаў у паралелі школы, якія вывучаюць вышэйзгаданы факультатыўны курс. Прапануецца і трэцяя мадэль — стварэнне ў сельскай мясцовасці міжшкольнага факультатыву.

Факультатыўны курс разлічаны на 140 гадзін і падзелены на чатыры змястоўныя модулі: «У свеце педагагічнай прафесіі» (10 клас), «Чалавек, які пазнае: практычная псіхалогія пазнання» (10 клас), «Я ў педагагічнай прафесіі» (11 клас) і «Пазнай самога сябе» (11 клас).

Змест праграмы факультатыўных заняткаў прымушае старшакласнікаў шукаць адказы на шэраг пытанняў. Што такое педагагічная прафесія? Якое месца педагогікі ў свеце іншых прафесій? У чым яе спецыфіка? Якія патрабаванні прад'яўляюцца да настаўніка? Што ён павінен умець? Якімі якасцямі павінен валодаць? Ці магу я быць настаўнікам? Ці ёсць у мяне прафесійна важныя якасці? І гэтак далей.

На працягу двух гадоў навучання школьнік стварае партфоліа «Я — педагог». У ім фіксуюцца вынікі яго вучэбнай і педагагічнай дзейнасці па засваенні ўсіх чатырох модуляў вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў: эсэ, творчыя заданні, даныя самадыягностыкі, прэзентацыі, праекты, праца важатымі, памочнікамі класных кіраўнікоў у малодшых класах, валанцёрамі ў аздараўленчых лагерах, удзел у арганізацыі розных школьных мерапрыемстваў і гэтак далей. Там жа збіраюцца ацэначныя каментарыі педагогаў, аднакласнікаў і вынікі рэфлексіі самога навучэнца.

У 20-й сталічнай гімназіі вучні вядуць свае педагагічныя блогі ў сацыяльных сетках: «Інстаграм», «Фэйсбук», «ВКонтакте» ці «Твітары». Там жа яны дзеляцца з фатаграфіямі сваіх педагагічных спроб. Натуральна, што крэатыўнасць толькі вітаецца!

Напрыканцы навучання на падставе партфоліа адзінаццацікласнікі атрымаюць разгорнутую характарыстыку-рэкамендацыю педагагічнага савета для паступлення на педагагічныя спецыяльнасці, якая будзе заверана ў раённым упраўленні адукацыі.

Дарэчы, мяркуецца, што выпускнікі педагагічных класаў будуць карыстацца правам паступлення на педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў. У прыватнасці, тыя, хто атрымаюць рэкамендацыю педагагічнага савета і будуць мець у атэстаце адзнакі «7» балаў і вышэй па ўсіх прадметах вучэбнага плана, а па прадметах профільных іспытаў у ВНУ — не ніжэй як «8» балаў. Зразумела, не ўсіх школьных выдатнікаў ці «харашыстаў» можна дапускаць у школу ў якасці педагогаў. Менавіта таму і ўзнікла ідэя з партфоліа...

### ПРАЦА НАД ІМІДЖАМ

У сярэдзіне навучальнага года педуніверсітэт правёў рэспубліканскае апытанне навучэнцаў педагагічных класаў, а таксама настаўнікаў, якія вядуць факультатыўныя заняткі «Уводзіны ў педагагічную прафесію». Высветлілася, што **прычыны выбару старшакласнікамі навучання ў педагагічных класах самыя разнастайныя. Сярод іх дамінуе матыў, звязаны з жаданнем вывучаць пэўныя прадметы на павышаным узроўні (36%). На другім месцы — матыў, звязаны з гатоўнасцю звязаць сваё жыццё з педагагічнай прафесіяй (24%). Далей ідуць магчымасць паступіць на педагагічную спецыяльнасць без экзаменаў (20%) і рэкамендацыя бацькоў (18%).**

Увагі заслугоўваюць і матывы, па якіх педагогі вырашылі выкладаць факультатыўны курс «Уводзіны ў педагагічную прафесію»: гэта магчымасць папулярызаваць педагагічную прафесію, дзяліцца са старшакласнікамі сваім педагагічным вопытам і ўплываць на іх рашэнне звязаць сваё жыццё з педагагічнай прафесіяй.

Даныя апытання сведчаць аб тым, што факультатыўныя заняткі дапамагаюць навучэнцам зразумець сутнасць і асаблівасці педагагічнай прафесіі: так сцвярджаюць 73% навучэнцаў і 54% настаўнікаў.

— Паказальная розніца ў адказах вучняў і настаўнікаў па гэтым пытанні. Відавочна, што педагогі больш песімістычныя ў сваіх прагнозах, чым навучэнцы, — адзначыў Аляксандр Жук. — Для нас гэта сігнал аб тым, каб мы больш давяралі вучням, іх здольнасцям да самавызначэння і рэфлексіі. Разумеючы агульнаразвіццёвую функцыю факультатыўных заняткаў, мы высвятлялі, наколькі выразна гэта праглядаецца ў змесце факультатыву і ацэньваецца навучэнцамі і настаўнікамі. Вынік адназначна станоўчы: пераважная большасць і настаўнікаў (85%), і вучняў (82%) аднадушныя ў меркаванні, што такія заняткі карысныя для асобаснага развіцця, незалежна ад таго, вучацца старшакласнікі ў педагагічным класе ці не.

І навучэнцам, і педагогам былі найбольш цікавыя тэмы «Будучыня педагагічнай прафесіі», «Імідж сучаснага педагога», блок заняткаў, скіраваных на самапазнанне сваіх здольнасцяў. Іх выбіралі ў сваіх адказах часцей за іншыя. У ліку найбольш цікавых тэм аказаліся і сустрэчы з ветэранамі педагагічнай працы.

«Трэба ацаніць і выкарыстоўваць патэнцыял такой формы работы з вучнямі па папулярызацыі прафесіі, як, зрэшты, і заняткі, прысвечаныя іміджу сучаснага педагога», — упэўнены Аляксандр Жук.

### САЮЗ З БАЦЬКАМІ

Аптымістычнымі аказаліся і адказы на пытанне аб прафесійных намерах старшакласнікаў: траціна апытаных сцвярджаюць, што ўжо вызначыліся з выбарам педагагічнай прафесіі (34%). Але большая частка пакуль не вызначылася (56%). «Гэтыя навучэнцы з'яўляюцца нашым рэзервам, той мэтавай групай, на якую трэба будзе ў першую чаргу звярнуць увагу ў 11-м класе,» — дадаў Аляксандр Жук.

Як сведчыць атрыманы вопыт, эфектыўнасць педагагічных класаў залежыць у канчатковым выніку ад педагога, які займаецца з вучнямі. Для таго, каб сфарміраваць у старшакласнікаў матывацыю і ўмацаваць іх рашэнне выбраць педагагічную спецыяльнасць, вельмі важна, каб гэты факультатыў вялі ўлюбёныя ў сваю прафесію настаўнікі, якія дасягнулі ў ёй пэўных вышынь, прафесіяналы, якія на ўласным прыкладзе дэманструюць, што ў педагогіцы ёсць месца паспяховым і ўпэўненым у сабе людзям.

**У 20-й сталічнай гімназіі вучні вядуць свае педагагічныя блогі ў сацыяльных сетках: «Інстаграм», «Фэйсбук», «ВКонтакте» ці «Твітары». Там жа яны дзеляцца і фатаграфіямі сваіх педагагічных спроб. Натуральна, што крэатыўнасць толькі вітаецца!**

Яшчэ адзін важны кірунак — праца з бацькамі навучэнцаў педагагічных класаў, якія могуць або падтрымаць выбар дзіцяці, або, наадварот, навязаць ім сваю думку і свой выбар. Для школы яны галоўныя саюзнікі...

А ў далейшых планах БДПУ — умацненне дапрофільнай педагагічнай падрыхтоўкі на другой ступені школы. Рэктар паведаміў, што ў краіне ёсць установы адукацыі, гатовыя стварыць на сваёй базе педагагічную гімназію, якая прадугледжвае арыентацыю школьнікаў на педагагічную прафесію, пачынаючы з 5-га класа. У перспектыве ў кожным рэгіёне краіны хацелася б адкрыць хоць бы па адной педагагічнай гімназіі. А пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце марыць адкрыць яшчэ і педагагічны ліцэй.

**Надзея НІКАЛАЕВА. Фота аўтара.**
nikalaeva@zviazda.by

■ Будзь у курсе!

## У ВІЛЬНЮС ЧЫГУНКАЙ — БЕЗ ПРАБЛЕМ

**Беларуская чыгунка прызначыла дадатковы цягнік міжнародных ліній №809/810 Мінск — Вільнюс з 14 ліпеня. Састаў будзе курсіраваць у дзённы час чатыры разы на тыдзень па панядзелках, аўторках, серадах і чацвяргах, паведамілі ў прэс-службе магістралі.**

Цягнік будзе адпраўляцца з Мінска ў 14 гадзін 03 хвіліны і прыбываць у Вільнюс у 17 гадзін. У зваротным напрамку ён адпраўляцца ў 12 гадзін 30 хвілін і прыбудзе ў Мінск у 15 гадзін 27 хвілін. Памежны і мытны кантроль на тэрыторыі Беларусі пасажыры будуць праходзіць на станцыі Гудагай, а на тэрыторыі Літвы — у тэрмінале станцыі Вільнюс. Пасажырам, якія прыбываюць цягнікамі з Мінска ў Вільнюс і жадаюць далей прадоўжыць свой маршрут да Балтыйскага ўзбярэжжа да Клайпеды, пры прад'яўленні праязных дакументаў на праезд ад Мінска да Вільнюса ў касах АТ "Літоўскія чыгункі" прадастаўляецца зніжка ў 10 працэнтаў. Мэтай рэалізацыі гэтага праекта з'яўляецца ўзмацненне транспартных сувязяў паміж сталіцамі Беларусі і Літвы, пашырэнне магчымасцяў пасажыраў у выбары варыянту паездкі, павышэнне якасці аказваемых паслуг.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

■ Ёсць нагода

## ЗВЯЗАНЫЯ АДНОЙ МЭТАЙ

### Сёння беларускі будуць вязаць у публічных месцах

**У адну з субот чэрвеня ў розных краінах адзначаецца неафіцыйнае, нетрадыцыйнае, але ад таго не менш цікавае свята — Сусветны дзень вязання на публіцы (World Wide Knit in Public Day). Як сцвярджаюць энтузіясты вязальнага руху, яго заснавальніцай стала жыхарка Парыжа Даніэль Лендэс, якая ў 2005 годзе падахвоціла сваіх прыяцелек пакінуць душныя кватэры і ўзяць кошыкі з рукадзеллем на вольнае паветра.**



Ідэя хутка набыла папулярнасць і ў аматараў вязання з іншых краін. Цяпер майстры не толькі займаюцца любімым хобі ў грамадскіх месцах (у парках, кавярнях, у грамадскім транспарце і нават у бібліятэцы!), але таксама дзеляцца з усімі ахвотнымі сакрэтамі вязання пруткамі ці кручком, арганізуюць дабрачынныя кірмашы вязаных вырабаў і нават праводзяць адмысловыя спаборніцтвы вязальшчыц. У акцыі нават з'явілася міжнародная эмблема — два перакрыжаваныя пруткі на фоне геаграфічнай карты Еўропы. Зрэшты, гэты лагатып паспеў ужо страціць актуальнасць — цяпер, паводле розных крыніц, Сусветны дзень вязання праходзіць не менш як у 300 гарадах Еўропы і ЗША, а сёлета да яго далучацца прадстаўніцы Кітая, Інданезіі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Аўстраліі...

Дарэчы, вось ужо некалькі гадоў, як з гэтай справай шчыльна «звязаліся» і беларусы. Напрыклад, у 2012 годзе ўдзельніцы публічнага вязальнага флэшмобу зладзілі ў сталічным парку Перамогі адкрыты майстар-клас для аматараў гэтага віду рукадзелля, выставу сваіх твораў, а таксама імправізаваны модны паказ. Плануецца зладзіць «выхад у людзі» і сёлета, прычым не толькі ў Мінску. Так, у Брэсце сёння ў межах Сусветнага дня вязання, акрамя ўласна вязання на публіцы, адбудзецца дабрачынная акцыя — перадача вязаных шалікаў, пальчатак і шкарпэтак у падарунак дзецям, якія знаходзяцца ў гарадскім сацыяльным прытулку.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**